(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 882.6.09 – 3

**ДАРАГАКУПЕЦ Аксана Міхайлаўна**

# ТЭНДЭНЦЫІ РАМАНТЫЗАЦЫІ І ІНТЭЛЕКТУАЛІЗАЦЫІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРОЗЕ

10.01.01 – беларуская літаратура

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Мінск – 2005

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік - кандыдат філалагічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі
**Бугаёў Дзмітрый Якаўлевіч,**
(Беларускі дзяржаўны універсітэт, кафедра беларускай літаратуры і культуры)

Афіцыйныя апаненты: доктар філасофскіх навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі
**Конан Уладзімір Міхайлавіч,**
(Навукова-асветніцкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка);

кандыдат філалагічных навук,
**Дудзінская Дзіна Іосіф-Тадэвушаўна**
(Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, аддзел сучаснай беларускай літаратуры)

Апаніруючая арганізацыя – Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт

Абарона дысертацыі адбудзецца 9 чэрвеня ў 14.30 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 у Беларускім дзяржаўным універсітэце (220050, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара – 222-33-66).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта (г. Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 4).

Аўтарэферат разасланы "4" мая 2005 года

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар філалагічных навук,
прафесар — А.І. Бельскі

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы даследавання.** Да адлюстравання гістарычнага мінулага беларускія пісьменнікі звярнуліся ў XIX ст. Аднак з шэрагу прычын – адносна запозненага станаўлення літаратурнага працэсу, арыентацыі крытыкі і літаратуразнаўства ў першую чаргу на аналіз адлюстравання ў літаратуры актуальных грамадска-палітычных праблем і інш., – гістарычная проза беларускімі даследчыкамі працяглы час не разглядалася як самастойная мастацкая сістэма са спецыфічнымі эстэтычнымі законамі і тэндэнцыямі. Папулярнасць прозы У. Караткевіча, якая мела ў сабе ўсе рысы сапраўды гістарычнай, а пазней, у 1980–1990-я гг., поспех сярод чытача твораў В. Іпатавай, Л. Дайнекі, У. Арлова, В. Чаропкі і іншых пісьменнікаў спрыялі развіццю літаратуразнаўчай думкі пра асаблівасці беларускай гістарычнай прозы. Так, ужо ў 60-я гг. XX ст. у Беларусі з'яўляюцца артыкулы В. Каваленкі, А. Лойкі, А. Мальдзіса, Д. Бугаёва, У. Калесніка і іншых; у 70-я гады абараніла дысертацыю на тэму "Беларускі гістарычны раман (станаўленне жанра)" Л. Прашковіч. У 1980–1990-я гг. з'яўляецца і шэраг манаграфій (А. Верабей "Жывая повязь часоў: Нарыс творчасці У. Караткевіча" (1985), "Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творчасці У. Караткевіча" (1997); А. Мальдзіс "Жыцце і ўзнясенне У. Караткевіча: Партрэт пісьменніка і чалавека" (1990); А. Русецкі "Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць" (1991); В. Шынкарэнка "Пад ветразем дабра і прыгажосці" (1995) і іншыя), у якіх асвятляецца найперш творчасць У. Караткевіча, а таксама некаторыя аспекты гісторыі, тэорыі і паэтыкі гістарычнага рамана, аналізуюцца асобныя творы на гістарычную тэму ў розных жанрах. Паэтыка гістарычнага твора, якая разглядаецца на прыкладзе творчасці сучасных пісьменнікаў, становіцца прадметам даследавання ў манаграфіях В. Шынкарэнкі "На скрыжалях гісторыі" (1999), "Нястомных пошукаў дарога" (2002). Аднак да гэтага часу няма літаратуразнаўчага даследавання, у якім бы не толькі вылучаліся, але і паслядоўна аналізаваліся дамінантныя тэндэнцыі развіцця беларускай гістарычнай прозы на сучасным этапе. Не вывучаліся асобна тыя традыцыі інтэлектуальнага заходнееўрапейскага рамана з сюжэтамі паводле сусветнай гісторыі, якія аказаліся найбольш запатрабаванымі ў творчасці беларускіх аўтараў. Такім чынам, сёння існуе дастатковы матэрыял і ёсць навуковая патрэба даследавання эвалюцыі беларускай гістарычнай прозы як у святле гісторыі нацыянальнай літаратуры, так і ў яе сувязях з іншанацыянальным літаратурным кантэкстам.

Патрабуе асэнсавання гістарычная проза пісьменнікаў канца XX–пачатку XXI ст. (У. Арлова, А. Наварыча, А. Федарэнкі і інш.), якая складае значны пласт сучаснай літаратуры і ў якой назіраюцца новыя тэндэнцыі ў адлюстраванні мінулага, характэрныя і для іншых славянскіх літаратур.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя выканана ў адпаведнасці з планавымі тэмамі кафедры беларускай

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


літаратуры і культуры Белдзяржуніверсітэта "Дынаміка беларускага літаратурнага працэсу XX стагоддзя" (2001–2005), НДР 201; "Канцэптуальныя асновы беларускай літаратуры XX стагоддзя як цэласнага гісторыка-культурнага перыяду" (2001–2005), НДР 615/96.

**Мэта і задачы даследавання** – вылучыць і ахарактарызаваць асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай гістарычнай прозы на сучасным этапе праз раскрыццё спецыфікі мастацкага адлюстравання гісторыі ў кантэксце сучаснасці. Для рэалізацыі згаданай мэты ставяцца наступныя задачы:

1) прааналізаваць і сістэматызаваць погляды літаратуразнаўства (найперш беларускага, рускага) на спецыфіку гістарычнай прозы;
2) вызначыць уплыў пазалітаратурных (грамадска-палітычных, гісторыка-культурных) і унутрылітаратурных фактараў на мастацкае адлюстраванне гісторыі;
3) даследаваць праяўленне рамантычнага і інтэлектуальнага ў сучаснай гістарычнай прозе, прасачыць узаемасувязь гэтых двух пачаткаў;
4) даследаваць тэндэнцыю інтэлектуалізацыі ў беларускай гістарычнай прозе ў кантэксце славянскіх і іншых еўрапейскіх літаратур;
5) прааналізаваць новыя спосабы і прыёмы мастацкага асэнсавання гістарычнага матэрыялу ў творах беларускіх пісьменнікаў;
6) вылучыць спецыфічную адметнасць сучаснай беларускай гістарычнай прозы.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляецца беларуская гістарычная проза XX–пачатку XXI ст. **Прадмет** даследавання – тэндэнцыі развіцця беларускай гістарычнай прозы. Разглядаюцца гістарычныя раманы, аповесці і апавяданні У. Караткевіча, В. Іпатавай, Л. Дайнекі, В. Чаропкі, К. Тарасава, У. Арлова, А. Наварыча, А. Асіпенкі, А. Федарэнкі, іншых аўтараў, а таксама шэраг дакументальна-мастацкіх твораў, у якіх выяўлены аўтарскія канцэпцыі гістарычных эпох.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання** грунтуецца на асноўных прынцыпах параўнальна-гістарычнага метаду даследавання і прыёмах кампаратыўнага літаратуразнаўства. У дысертацыйнай працы выкарыстоўваюцца таксама метады і прыёмы іншых дапаможных літаратуразнаўчых (бібліяграфія, крыніцазнаўства) і гістарычных (гістарыяграфія) дысцыплін. Метадалагічнай базай дысертацыі паслужылі працы аўтарытэтных айчынных і замежных вучоных у галіне літаратуразнаўства.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** У айчынным літаратуразнаўстве дадзенае даследаванне з'яўляецца арыгінальнай дысертацыйнай працай, у якой комплексна разглядаецца развіццё беларускай гістарычнай прозы XX–пачатку XXI ст. з улікам спецыфікі нацыянальнай традыцыі і літаратурных узаемадзеянняў на сучасным этапе; вывучаецца ўзбагачэнне жанрава-відавой сістэмы гістарычнай літаратуры; аналізуецца жанрава-стылёвая адметнасць гістарычнай прозы; даецца ідэйна-эстэтычная

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

характарыстыка паасобных твораў, вызначаецца іх месца ў гісторыі літаратуры; аналізуецца мастацкі стыль пісьменнікаў, якія прыйшлі ў літаратуру ў 80-я гг. XX ст. і чые творы складаюць прыкметную стылёвую плынь у сучаснай прозе (У. Арлоў, А. Наварыч, А. Федарэнка, іншыя). Упершыню даследуецца нацыянальная спецыфіка беларускай гістарычнай прозы праз вылучэнне і аналіз развіцця дзвюх асноўных тэндэнцый – рамантызацыі і інтэлектуалізацыі – як дамінантных і прыярытэтных у фарміраванні сучаснай беларускай гістарычнай прозы.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы і вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы агульных лекцыйных і спецыяльных курсаў па гісторыі беларускай літаратуры XX ст. у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, а таксама пры выкладанні беларускай літаратуры ў сярэдніх школах, гімназіях, ліцэях.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Часам узнікнення і станаўлення гістарычнай прозы ў беларускай літаратуры трэба лічыць другую палову XIX–пачатак XX ст. Нягледзячы на адносную запозненасць свайго ўзнікнення, беларуская гістарычная проза перажывае класічную для большасці еўрапейскіх літаратур эвалюцыю. Гістарычнае мастацкае мысленне прайшло наступныя стадыі: *фальклорна-міфалагічнае* (Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, В. Дунін-Марцінкевіч) і *рамантычна-міфалагічнае* ўзнаўленне мінулага (К. Каганец, Я. Купала, М. Багдановіч); *дакументальна-канкрэтызаваная рэканструкцыя* мінулага (М. Гарэцкі, В. Ластоўскі); асэнсаванне гісторыі як *цэласнага працэсу перадачы* назапашанага народам (нацыяй) *духоўнага і інтэлектуальнага вопыту* (У. Караткевіч і яго паслядоўнікі); выкарыстанне гістарычнага матэрыялу як *асновы для асэнсавання і пераасэнсавання сучаснасці* (пісьменнікі мяжы XX–XXI ст.).

2. На сучасным этапе асноўнымі з'яўляюцца дзве ўзаемазвязаныя, але і выразна адрозныя тэндэнцыі развіцця беларускай гістарычнай прозы: рамантызацыя і інтэлектуалізацыя гісторыі. Першая, з перавагай героіка-рамантычнага пачатку і арыентацыяй на поўнае або частковае ўзнаўленне рэальных гістарычных падзей, якая суадносіцца з "вальтэрскотаўскай" традыцыяй, традыцыяй Г. Сянкевіча, Ю. Крашэўскага і іншых, бярэ пачатак ад прозы У. Караткевіча і яго папярэднікаў і развіваецца ў творах В. Іпатавай, Л. Дайнекі, А. Наўроцкага, В. Чаропкі, К. Тарасава, Л. Рублеўскай. Другая тэндэнцыя арыентаваная ў першую чаргу на інтэлектуальнае, індывідуальна-аўтарскае асэнсаванне гісторыі з адносна меншым значэннем гістарычнага факта; яна выкарыстоўвае адпаведныя элементы з уласна нацыянальнай (В. Ластоўскі, У. Караткевіч) і агульнаславянскай спадчыны, а таксама суадносіцца з традыцыямі еўрапейскай (у тым ліку нямецкамоўнай – Л. Фейхтвангер, Б. Брэхт, С. Цвэйг, эстонскай – Я. Крос) літаратур. Інтэлектуальнае асэнсаванне гісторыі праз яе метафарызацыю на розных узроўнях назіраецца ў творчасці А. Асіпенкі, У. Арлова, А. Наварыча,

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

А. Федарэнкі, А. Астраўцова, А. Гуцава. У творчасці гэтых аўтараў інтэнсіўна развіваецца проза гістарычнай тэматыкі з дамінаваннем ускладненых метафар нацыянальнай гісторыі.

3. Сістэма традыцыйных узораў гістарычнай прозы ў сучаснай беларускай літаратуры пашыраецца за кошт такіх жанрава-стылёвых разнавіднасцей дакументальна-мастацкай літаратуры, як нарысы, у якіх белетрызуецца гісторыя (творы У. Арлова, У. Бутрамеева, К. Тарасава, В. Чаропкі); гісторыка-літаратурныя біяграфіі выдатных у нацыянальнай традыцыі асоб (аповесці і раманы С. Александровіча, Л. Арабей, В. Карамазава, В. Коўтун, А. Лойкі, Я. Міклашэўскага, М. Тычыны, В. Хомчанкі, Э. Ялугіна); "калектыўныя" дакументальна-мастацкія "рэпартажы з мінулага" як гістарычныя сведчанні (А. Адамовіча, С. Алексіевіч і іншых). Гэты працэс сведчыць пра актыўную стылеўтваральную ролю гістарычнай тэматыкі ў беларускай літаратуры на сучасным этапе.

4. Вызначальнай рысай сучаснай беларускай гістарычнай прозы з'яўляецца пашырэнне ў ёй умоўна-метафарычнай стылёвай плыні. Для асэнсавання і пераасэнсавання аксіялагічных катэгорый у беларускай гістарычнай прозе пісьменнікі выкарыстоўваюць іншасказанне, двухпланавасць непасрэднага адлюстравання, розныя формы ўмоўнасці, стылёвыя прыёмы постмадэрніцкага пісьма, для іх твораў характэрна адметная шматзначная сімвалічнасць.

5. Сучасная беларуская гістарычная проза працягвае адыгрываць надзвычай вялікую ролю ў тварэнні нацыянальнай культурнай прасторы. Праз рэканструкцыю гістарычных эпох, у тым ліку і XX стагоддзя як завершанага гістарычнага перыяду, сучасныя аўтары сцвярджаюць традыцыйныя маральна-этычныя каштоўнасці, імкнуцца фарміраваць нацыянальную ідэю і нацыянальную самасвядомасць беларускага народа як актыўнага чынніка сусветнай гісторыі.

**Асабісты ўклад дысертанта.** Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем яе аўтара.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэннях кафедры беларускай літаратуры XX стагоддзя (пратакол № 11 ад 29 чэрв. 2004 г.) і кафедры беларускай літаратуры і культуры (пратакол № 1 ад 17 ліст. 2004 г.) Беларускага дзяржаўнага універсітэта і рэкамендавана да абароны (пратакол № 1 ад 17 ліст. 2004 г.). Асноўныя яе палажэнні выкладаліся ў дакладах і паведамленнях на міжнародных навуковых канферэнцыях: "Янка Купала і Якуб Колас у кантэксце славянскіх літаратур" (Мінск, 3–4 кастр. 2002 г.); "Славянскія літаратуры ў сусветным кантэксце: Праблемы развіцця беларускай і рускай літаратур" (Мінск, 8–10 кастр. 2003 г.), "Руска-беларускае літаратурнае ўзаемадзеянне: Гісторыя, сучасны стан, перспектывы" (Брэст, 17–19 снеж. 2003 г.); "Руская, беларуская і сусветная літаратура: Гісторыя, сучаснасць, узаемасувязі" (Наваполацк, 8–10 красав. 2004 г.); XI Міжнароднай навуковай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных "Ламаносаў –

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

2004" (Масква, 12–15 красав. 2004 г.); "Літаратурнае Палессе ў постацях і лёсах" (Мазыр, 17–18 ліст. 2004 г.); рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях: "Жыццём слугуючы Айчыне" (Брэст, 12–13 ліст. 1999), навукова-метадычнай канферэнцыі маладых вучоных БрДУ імя А.С. Пушкіна (Брэст, 18 19 мая 1999 г.), "Берасцейска-Пінскае Палессе: Мова, літаратура, гісторыя" (Брэст, 24–25 кастр. 2002 г.), "Філалагічныя навукі: Маладыя вучоныя ў пошуку" (Мінск, 25 красав. 2003 г.).

**Апублікаванасць вынікаў.** Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання выкладзены ў 10 публікацыях: 2 артыкулы апублікаваны ў навуковых часопісах, 1 – у навукова-метадычным часопісе, 7 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый. Агульны аб'ём апублікаванага – 52 старонкі.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, двух раздзелаў і заключэння агульным аб'ёмам 105 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц складае 317 найменняў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **"Уводзінах"** характарызуецца ступень тэарэтычнай распрацаванасці паняцця пра гістарычны твор, асэнсоўваюцца асаблівасці матэрыялу і падыходы да яго вывучэння ў літаратуразнаўстве (найперш беларускім і рускім). Для сістэматызацыі навуковых поглядаў на развіццё гістарычнай тэмы ў літаратуры ва "Уводзінах" разглядаюцца працы айчыннага і славянскага літаратуразнаўства, у якіх вызначаюцца агульнатэарэтычныя аспекты гістарычных твораў. Вывучэнне работ В. Рагойшы, Т. Камароўскай, Л. Аляксандравай, Л. Анінскага, В. Аскоцкага, А. Баканава, Н. Баселя, М. Бачарова, М. Бахціна, Ю. Борава, І. Варфаламеева, І. Горскага, Н. Дончанкі, Д. Затонскага, Н. Івановай, А. Пауткіна, С. Пятрова, Б. Рэізава, Ю. Сураўцава, Б. Сучкова, А. Філатавай, В. Чумак, В. Юдзіна і іншых дазволіла выявіць агульныя вызначальныя рысы гістарычнага твора, да якіх літаратуразнаўцы адносяць наступныя: адлюстраванне пісьменнікам гістарычнай эпохі, якая завяршыла сваё развіццё, стварэнне гістарычнага каларыту, наяўнасць у аповедзе гістарычных асоб, дакументальнай асновы, суаднесенасць гістарычных фактаў, заснаваных на дакументах, і аўтарскай фантазіі, сувязь гісторыі з сучаснасцю, гістарызм мыслення пісьменніка і інш.

У 1980–1990-я гг. да аналізу твораў на тэму мінулага звяртаюцца найперш тыя айчынныя літаратуразнаўцы (С. Андраюк, А. Бельскі, Г. Васючэнка, Т. Грамадчанка, І. Жук, В. Локун, А. Макарэвіч, І. Саверчанка, Л. Савік, А. Сідарэвіч, А. Сямёнава, Г. Тварановіч, М. Тычына, іншыя), каго зацікавіла ўласна гістарычная проза XX ст., а таксама найбольш значныя постаці пісьменнікаў, якія працавалі ў гэтай галіне. Аднак да сённяшняга дня ў літаратуразнаўстве не існуе агульнапрынятай тэарэтычнай дэфініцыі

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


гістарычнай прозы рамантычнага ўзнаўлення мінулага дазваляюць гаварыць пра выяўленне ў яговым творы рыс постмадэрнісцкага пісьма.

Асэнсаванне мінулага з акцэнтам на інтэлектуальны дыялог з чытачом назіраецца таксама ў творчасці А. Федарэнкі (раман "Рэвізія", аповесць "Нічые"), А. Асіпенкі (раман "Святыя грэшнікі"), А. Астраўцова (раман "Сула"), А. Гуцава (эсэ "Містэрыя залатога веку").

У рамане "Рэвізія" (1987, 1992, 2003) А. Федарэнка асэнсоўвае гісторыю найперш праз метафару. Робячы тэмаю твора роздумы пра літаратуру і літаратараў у сённяшнім жыцці, празаік акцэнтуе сваю ўвагу на ўзаемасувязі мінулага і сучаснага. Папярэднікам А. Федарэнкі ў распрацоўцы такой мастацкай формы гістарычнага аповеду выступіў А. Асіпенка, які ў рамане "Святыя грэшнікі", звярнуўшыся да часоў старажытнасці, паяднаў XII і XX стагоддзі праз вобразы галоўных герояў: Еўфрасінні Полацкай і Лазара Богшы, якія дзейнічаюць і ў гістарычнай даўніне, і ў сучаснасці. А. Федарэнка, творча мадэлюючы сітуацыю дваістага існавання галоўнага героя Трухана-Труханоўіча ў сучасным, канца 1980-х гадоў, і мінулым, пачатку XX ст., жыцці, выкарыстоўвае характэрны для постмадэрнізму прыём дэканструкцыі сітуацый, якія ўзяты з твораў іншых аўтараў, і стварэння на іх аснове новага мастацкага тэксту.

Характэрныя для твораў А. Наварыча і А. Федарэнкі спосабы і сродкі адлюстравання гістарычнай рэчаіснасці выкарыстоўвае таксама А. Гуцаў для правядзення аналогіі паміж мінулым і сённяшнім днём (эсэ "Містэрыя залатога веку").

Такім чынам, раманы "Літоўскі воўк" А. Наварыча, "Святыя грэшнікі" А. Асіпенкі, "Рэвізія" А. Федарэнкі, эсэ "Містэрыя залатога веку" А. Гуцава засведчылі, што інтэлектуальнае асэнсаванне мінулага, якое распачыналася ў В. Ластоўскага, замацоўвалася У. Караткевічам і назіралася ў творчасці У. Арлова, мае свой заканамерны працяг. Пісьменнікі выходзяць за рамкі гістарычна дакладнага адлюстравання падзей, праецыруючы пэўныя гістарычныя эпізоды на сучаснасць, а таксама суадносячы іх з узроўнем нацыянальнай свядомасці людзей XXI ст., што робіць раманы праблемнымі і інтэлектуальна насычанымі. У такіх творах, як правіла, выказваецца уласная аўтарская пазіцыя, а сама далёкая гістарычная рэчаіснасць пададзена праз рэальнасць аўтарскай эпохі. У. Арлоў, А. Наварыч, А. Федарэнка вялікую ўвагу надаюць абмалёўцы характараў галоўных герояў, якія пададзены асабліва завострана і буйным планам. Пісьменнікі ўзбагацілі стылёвы спектр гістарычнага твора, выкарыстаўшы паасобныя прыёмы паэтыкі постмадэрнізму, такія як гульня, іронія, дэканструкцыя сталых сюжэтных сітуацый і інш. Адзначаная асаблівасць дазваляе гаварыць аб пачатку развіцця ў беларускай гістарычнай прозе новага кірунку, калі трагічнае і балючае для беларусаў мінулае пісьменнікамі паказваецца без традыцыйнага піетэту. У беларускай літаратуры гісторыя становіцца для пісьменніка сэнсава ёмістым, камунікатыўна прыдатным матэрыялам для вырашэння сучасных праблем і

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

папулярызацыі аўтарскіх ідэй, што сведчыць пра развіццё беларускай гістарычнай прозы ў рэчышчы, агульным для гістарычнай раманістыкі славянскіх і іншых еўрапейскіх літаратур.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Аналіз спецыфікі беларускай гістарычнай прозы, выяўленне асаблівасцей мастацкага адлюстравання гісторыі пісьменнікамі ў кантэксце як асобных гістарычных перыядаў, так і ў рамках сучаснай літаратурнай традыцыі дазволілі выявіць асноўныя тэндэнцыі яе развіцця. У дысертацыйнай працы ўлічаны той факт, што ў параўнанні з многімі заходнееўрапейскімі літаратурамі ў беларускай гістарычная тэматыка пачала развівацца значна пазней, аднак у цэлым эвалюцыя гістарычнай прозы адпавядае агульным еўрапейскім тэндэнцыям. У выніку праведзенага даследавання робяцца наступныя высновы:

1. У сучаснай беларускай прозе існуюць дзве асноўныя тэндэнцыі мастацкага асэнсавання гісторыі: гэта тэндэнцыі рамантызацыі і інтэлектуалізацыі. Першая рэалізуецца ў фальклорна-міфалагічным і рамантычна-міфалагічным узнаўленні мінулага, у дакументальна-канкрэтызаванай рэканструкцыі былых часоў; у асэнсаванні гісторыі як цэласнага працэсу перадачы назапашанага гістарычнага вопыту. Рамантызацыя бярэ пачатак з творчасці У. Караткевіча і яго папярэднікаў. Проза, у якой рамантызуецца гісторыя (В. Іпатавай, Л. Дайнекі, К. Тарасава, В. Чаропкі, У. Арлова, А. Наўроцкага, Л. Рублеўскай), выконвае пазнаваўча-эстэтычную функцыю, сцвярджае традыцыйныя маральна-этычныя каштоўнасці. Для яе характэрныя патрыятычны пафас, займальнасць, інтрыга, авантурнасць, шматгеройная структура, шырокае выкарыстанне фальклорнага матэрыялу і інш. [1, 4, 10].

2. Інтэлектуальная тэндэнцыя, дзе пэвалюе думка, а не гістарычны факт, узмацняецца суб'ектыўная, аўтарская, а не агульнапрынятая або агульнавядомая, канцэпцыя гісторыі, прадстаўленая ў беларускай прозе творчасцю А. Асіпенкі, У. Арлова, А. Наварыча, А. Астраўцова, А. Федарэнкі, А. Гуцава. Гістарычны матэрыял выкарыстоўваецца пісьменнікамі як аснова для асэнсавання і пераасэнсавання сучаснасці. У якасці асноўнага мастацкага прыёму філасофскага абагульнення мінулага тут выступае аўтарская перакадзіроўка сэнсаў, стварэнне метафар другога і трэцяга ўзроўняў. Сталая творчасць У. Арлова найбольш выразна рэпрэзентуе працэс узбуйнення ў літаратуры канкрэтна-гістарычнага, лакальнага да ўмоўна-метафарычнага, універсальнага мастацкага бачання, асэнсавання і паказу гістарычнага. Інтэлектуальная тэндэнцыя ў сучасным беларускім гістарычным пісьменстве рэалізуецца таксама ў развіцці такіх форм дакументальна-мастацкай прозы, як нарысы, у якіх белетрызуецца гісторыя, У. Арлова, У. Бутрамеева, К. Тарасава, В. Чаропкі; літаратурныя біяграфіі гістарычных асоб С. Александровіча, Л. Арабей, В. Карамазава, В. Коўтун, А. Лойкі, Я. Міклашэўскага, В. Хомчанкі,

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


Э. Ялугіна; дакументальна-мастацкія рэпартажы з гісторыі XX стагоддзя С. Алексіевіч, А. Адамовіча і іншых [2, 3, 7, 9].

3. Узрастанне ролі ўмоўна-метафарычнага ў мастацкім асэнсаванні гісторыі не з'яўляецца спецыфічнай нацыянальнай з'явай, яна вылучаецца ва ўсіх сучасных развітых літаратурных традыцыях. Калі тэндэнцыя рамантызацыі ў беларускай гістарычнай прозе арыентаваная на вопыт найперш французскай і польскай літаратур, то тэндэнцыя інтэлектуалізацыі – на вопыт нямецкай і эстонскай. У беларускай, як і, напрыклад, эстонскай і чэшскай літаратурах, гістарычная проза давала пісьменніку таксама магчымасць вырашаць праблему незалежнасці асобы ва ўмовах трагічнай нацыянальнай гісторыі. У рамках тэндэнцыі інтэлектуалізацыі гісторыя выступае як шматкампанентны матэрыял для даследавання анталагічных сутнасцей, філасофскіх катэгорый і псіхалагічных калізій, характэрных для сучаснасці [7, 10].

4. Умоўна-метафарычную стылёвую плынь у беларускай прозе характарызуюць наступныя рысы і мастацка-выяўленчыя формы: праблемнасць, двухпланавасць непасрэднага адлюстравання і абагульняльнага значэння, розныя формы ўмоўнасці, філасофска-эстэтычная іншасказальнасць, адметная шматзначная сімвалічнасць, перавага інтэлектуальнага пачатку над вобразным. Пералічаныя якасці з'яўляюцца характэрнымі рысамі парабалы як комплекснага мастацкага прыёму. Найбольш ярка парабалічныя тэндэнцыі ў адлюстраванні мінулага выявіліся ў раманах "Святыя грэшнікі" А. Асіпенкі і "Рэвізія" А. Федарэнкі, у аповесці "Сны імператара" У. Арлова. Працэс выпрацоўкі і засваення вышэй пералічаных стылёвых асаблівасцей знаходзіцца ў карэляцыі з агульнымі тэндэнцыямі ўзбагачэння стылёвага спектру сучаснай беларускай літаратуры. У прыватнасці, выкарыстоўваюцца паасобныя прыёмы, характэрныя для мастацкай сістэмы постмадэрнізму: гульня, цытацыя, татальная іронія і інш. Адзначаныя рысы постмадэрнісцкага адлюстравання гісторыі асабліва выразна выявіліся ў рамане А. Наварыча "Літоўскі воўк", у якім аўтар спалучыў прыёмы гістарычнага, фантастычнага, авантурнага, псіхалагічнага раманаў [3, 7, 9].

5. Спецыфічная адметнасць беларускай гістарычнай прозы праяўляецца ў выбары прадмета для мастацкага адлюстравання і асабліва ў той ролі, якую яна адыгрывае ў нацыянальнай культурнай прасторы. Акрамя агульных для мастацкай літаратуры функцый, гістарычная проза мае на мэце (як суб'ектыўна, на ўзроўні аўтарскай інтэнцыі, так і аб'ектыўна – праз успрыняцце чытацкай аўдыторыяй і крытыкай) рэканструкцыю нацыянальнай гісторыі, фарміраванне і ўзмацненне нацыянальнай ідэі і свядомасці, прапагандаванне ідэі гістарычнай і дзяржаўнай еднасці беларускага народа як шматэтнічнай супольнасці [1, 4].

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Артыкулы:**


1. Дарагакупец А.М. Вытокі беларускай гістарычнай прозы // Роднае слова. – 2003. – № 8 – С. 17–23.
2. Дарагакупец А.М. Традыцыі інтэлектуальнага гістарычнага рамана ў творчасці У. Арлова / Весн. Бел. дзярж. ун-та. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2004. – № 2. – С. 12–17.
3. Дарагакупец А.М. Спецыфіка інтэлектуальнага ў сучаснай беларускай гістарычнай прозе // Бел. літаратуразн. – 2004. – № 2. – С. 57–68.


**матэрыялы навуковых канферэнцый:**


4. Дарагакупец А.М. Мастацкае ўвасабленне гістарычнай рэчаіснасці ў аповесці Уладзіміра Арлова "Дзень, калі ўпала страла" // Научно-методич. конф. молодых учёных Брестск. гос. ун-та им. А.С. Пушкина: Сб. материалов, Брест, 18–19 мая 1999 г. / Брестск. гос. ун-т.; Отв. за выпуск С.К. Гребельная. – Брест, 1999. – С. 55–57.
5. Дарагакупец А.М. "З усіх турботаў роду чалавечага самы вялікі клопат – аб Радзіме" // Берасцейска-Пінскае Палессе: Мова, літаратура, гісторыя: Матэрыялы рэспубл. навук. канф., прысвеч. 80-годдзю з дня нараджэння У. Калесніка, Брэст, 24–25 кастр. 2002 г. / Брэсцкі дзярж. ун-т; Рэд. калегія: М.М. Аляхновіч, В.Я. Зарэцкая і інш. – Брэст, 2002. – С. 5–8.
6. Дарагакупец А.М. Коласаўскія традыцыі ў творчасці У. Арлова // Янка Купала і Якуб Колас у кантэксце славянскіх літаратур: Матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 3–4 кастр., 2002 г. / Акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы; Рэдкал.: У.В. Гніламёдаў (гал. рэд.). – Мінск, 2002. – С. 185–188.
7. Дарагакупец А.М. Ул. Арлоў і Я. Крос: Спроба тыпалагічнага параўнання // Славянскія літаратуры ў сусветным кантэксце: Праблемы развіцця беларускай і рускай літаратур: Матэрыялы VI Міжнар. навук. канф., Мінск, 8–10 кастр. 2003 г.: У 2 ч. / Бел. дзярж. ун-т; Пад агульн. рэд. І.А. Чароты. Мінск, 2003. – Ч. 2: Тыпалогія. Кантакталогія. Тэорыя літаратуры і культуры. – С. 35–39.
8. Дарагакупец А.М. Адметнасць стылю гістарычнай прозы У. Арлова // Філалагічныя навукі: Маладыя вучоныя ў пошуку: Матэрыялы навук. канф., Мінск, 25 красав. 2003 г. / Бел. дзярж. ун-т; Пад агульн. рэд. С.А. Важніка. – Мінск, 2004. – С. 236–238.
9. Дорогокупец О. Творчество В. Орлова в контексте белорусской исторической прозы // Материалы XI Междунар. научн. конф. студентов, аспирантов и молодых учёных "Ломоносов", Москва, 12–15 апр. 2004 г. / Московск. гос. ун-т им. М.В. Ломоносова. – М., 2004. – С. 174–175.
10. Дарагакупец А.М. Традыцыі французскага рамантызму ў беларускай гістарычнай прозе // Руска-беларускае літаратурнае ўзаемадзеянне: Гісторыя, сучасны стан, перспектывы: Матэрыялы Міжнар. навук. канф., Брэст, 18–19 снеж. 2003 г.: У 2 ч. / Брэсцкі дзярж. ун-т; Пад агульн. рэд. М.І. Мішчанчука. – Брэст, 2004. – Ч. 1. – С. 65–70.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## РЭЗЮМЭ

**Дарагакупец Аксана Міхайлаўна**

### Тэндэнцыі рамантызацыі і інтэлектуалізацыі ў сучаснай беларускай гістарычнай прозе

*Ключавыя словы:* гістарызм, тэндэнцыя, рамантызацыя, аксіялогія, дакументальнасць, інтэлектуалізацыя, проза, алегорыя, праблемнасць, парабала, умоўна-метафарычнае светаразуменне, паэтыка постмадэрнізму, гульня, іронія.

У дысертацыі на матэрыяле твораў пісьменнікаў канца XIX–пачатку XX ст., а таксама пісьменнікаў сярэдзіны XX–пачатку XXI ст. – У. Караткевіча, В. Іпатавай, Л. Дайнекі, К. Тарасава, В. Чаропкі, У. Арлова, А. Наварыча, А. Федарэнкі, А. Гуцава і іншых аналізуецца адметнасць беларускай гістарычнай прозы на розных этапах развіцця беларускай літаратуры. На аснове аналізу розных аўтарскіх падыходаў да адлюстравання мінулага вызначаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай гістарычнай прозы на сучасным этапе. Першая, з перавагай героіка-рамантычнага пачатку, якая суадносіцца з "вальтэрскотаўскай" традыцыяй, традыцыяй Г. Сянкевіча, Ю. Крашэўскага і іншых, бярэ пачатак ад У. Караткевіча і развіваецца ў творах В. Іпатавай, Л. Дайнекі, В. Чаропкі, К. Тарасава, Л. Рублеўскай. Другая тэндэнцыя арыентаваная ў першую чаргу на інтэлектуальнае асэнсаванне гісторыі, яна выкарыстоўвае адпаведныя элементы з уласна нацыянальнай і агульнаславянскай спадчыны, а таксама суадносіцца з традыцыямі еўрапейскай (нямецкамоўнай – Л. Фейхтвангер, Б. Брэхт, С. Цвэйг, эстонскай Я. Крос) літаратур. Асаблівая ўвага нададзена развіццю ўмоўна-метафарычнай стылёвай плыні ў сучаснай гістарычнай прозе (А. Асіпенка, А. Наварыч, А. Федарэнка і іншыя).

Метадалагічнай асновай дысертацыі з'яўляецца сістэмны падыход да з'яў літаратуры, выкарыстоўваюцца параўнальна-гістарычны метад даследавання і прыёмы кампаратыўнага літаратуразнаўства.

У дысертацыі ўпершыню даследуецца эвалюцыйнае развіццё гістарычнай прозы як у рэчышчы рамантычнага паказу гістарычнай рэчаіснасці, так і ў яе інтэлектуальна-аўтарскім асэнсаванні, ад канкрэтна-гістарычнага аповеду да пераважнага выкарыстання ўмоўна-метафарычнай паэтыкі.

Матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцыйных курсаў па беларускай літаратуры XX–XXI ст., а таксама пры распрацоўцы спецкурсаў і спецсемінараў для вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, у педагагічнай практыцы.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## РЕЗЮМЕ


**Дорогокупец Оксана Михайловна**

**Тенденции интеллектуализации и романтизации в современной белорусской исторической прозе**

*Ключевые слова:* историзм, тенденция, романтизация, аксиология, документальность, интеллектуализация, проза, аллегория, проблемность, парабола, условно-метафорическое стилевое мироосмысление, поэтика постмодернизма, игра, ирония.

В диссертации на материале произведений писателей XIX – начала XX века, а также писателей середины XX – начала XXI века – В. Короткевича, О. Ипатовой, Л. Дайнеко, К. Тарасова, В. Чаропки, В. Орлова, А. Новарича, А. Федоренки, А. Гуцева и др. анализируются особенности белорусской исторической прозы на разных этапах развития белорусской литературы. На основе анализа разных авторских подходов к изображению прошлого определяются основные тенденции развития белорусской исторической прозы на современном этапе. Первая, с преобладанием героико-романтического начала, которая соотносится с "вальтерскоттовской" традицией, традицией Г. Сенкевича, Ю. Крашевского и других, берёт начало от прозы В. Короткевича и развивается в произведениях О. Ипатовой, Л. Дайнеко, В. Чаропки, К. Тарасова, Л. Рублевской. Вторая тенденция ориентирована в первую очередь на интеллектуальное осмысление истории, она использует соответствующие элементы из национального и общеславянского наследия, а также соотносится с традициями европейской (немецкоязычной – Л. Фейхтвангер, Б. Брехт, С. Цвейг, эстонской – Я. Кросс) литератур. Особенное внимание уделено развитию условно-метафорического стилевого течения в современной исторической прозе (А. Осипенко, А. Новарич, А. Федоренко и др).

Методологической основой диссертации является системный подход к явлениям литературы, используются сравнительно-исторический метод исследования и приёмы компаративного литературоведения.

В диссертации впервые исследуется эволюционное развитие исторической прозы как в направлении романтического показа исторической реальности, так и её интеллектуально-авторском осмыслении, от конкретно-исторического повествования до предпочтения условно-метафорической поэтики.

Материалы диссертации могут быть использованы при подготовке лекционных курсов по белорусской литературе XX–XXI века, а также при разработке спецкурсов и спецсеминаров для высших и средних учебных заведений, в педагогической практике.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## SUMMARY

**Dorogokupets Oksana Mixailovna**

### The tendencies of intellectualization and Romanization in modern Byelorussian historical prose

**Key words**: historicism, tendency, romanization, documentation, intellectualization, prose, allegory, problematical character, parabola, conditional-metaphorical style current, poetic style of postmodernism, gamble, irony.

In the dissertation on the basis of the works of the writers of the end of XIX the beginning of XX centuries, and also writers of the middle XX – beginning of XXI centuries – V. Korotkevich, V. Ipatova, L. Daineko, K. Tarasov, V. Charopko, V. Orlov, A. Novarich, A. Phedorenko, A. Gutsev and others features of the Byelorussian historical prose at different stages of the development of the Byelorussian literature are analyzed. The basic tendencies of the development of the Byelorussian historical prose at the present stage are defined on the basis of the analysis of different authors' approaches to the picture of the past. The first one, with the prevalence of the heroic-romantic basis, originates at U. Korotkevich, and develops in the works of L. Daineko, V. Charopko, V. Ipatova, K. Tarasov, L. Rublevskaya. And it corresponds with so-called "Walter Scott" tradition, tradition of G. Senkevich, Y. Krashevskii and others. The second tendency is focused first of all on the intellectual understanding of history. It uses corresponding elements of actually national and all-Slavonic heritages and also corresponds with traditions of European (German-speaking – L. Pheixtvanger, B. Brext, S. Tsveig, Estonian – Y. Kross) literature.

The system approach to the phenomena of the literature is a methodological basis of the dissertation; a comparative-historical method of research in combination with the isolated analysis of the text and receptions of comparative literary criticisms are used.

In the dissertation evolution of historical prose from romantic illustration of a historical reality up to its intellectual-author's comprehension, from a concrete historical narration up to conditional-metaphorical style current is analyzed for the first time.

Materials of the dissertation can be used for the preparation of Byelorussian literature of XX–XXI centuries lecture courses, and also for the development of special courses and special seminars for the higher and secondary educational establishments, in a pedagogical practice.